# Уводзіны ў цудоўны свет бібліяграфіі

Калі вам неабходны кампетэнтны і ўважлівы да вашых інфармацыйных патрэб дарадчык, штомесячны бібліяграфічны бюлетэнь Нацыянальнай бібліятэкі рэспублікі "Новыя кнігі Беларусі" — лепшы варыянт.

У першым раздзеле "Навінкі беларускага друку" сабрана інфармацыя пра кнігі і найбольш значныя артыкулы з газет і часопісаў, што паступаюць у фонды Нацыянальнай бібліятэкі. Матэрыялы падраздзела "Пра Беларусь і яе жыхароў" прысвечаны гісторыі і сённяшняму дню Беларусі, жыццю беларускага замежжа, культуры, развіццю роднай мовы. Невялікія рубрыкі ўнутры падраздзела, якія змяняюцца адпаведна характару сабранай інфармацыі, адлюстроўваюць шырокую панараму цікавых тэм і глабальных праблем: тапаніміка, гісторыя рэлігіі, грамадска-палітычнае жыццё, дзейнасць партый, арганізацый, рухаў, сацыяльныя пытанні, экалогія, юрыдычныя кансультацыі і інш.

Наступная частка першага раздзела зацікавіць усіх, яна і называецца адпаведна — "Папулярна аб усім". У ёй знойдуць літаратуру для чытання аматары гісторыі і цікаўныя да псіхалогіі, нетрадыцыйных плыней рэлігіі, тыя, хто вывучае замежныя мовы, бізнесмены, бацькі, хатнія гаспадыні, уладальнікі прысядзібных участкаў і інш.

Назва падраздзела "Мастацкая літаратура" гаворыць сама за сябе. Тут прадстаўлены не толькі новыя кнігі і часопісныя публікацыі раманаў, аповесцей, паэм, але і перавыданні. Асобная ўвага ўдзяляецца аўтарам, якія былі незаслужана забыты, рэпрэсіраваны і раней публікаваліся вельмі мала.

Раздзел "Кнігі — дзецям" прадстаўляе юным чытачам новыя выданні навукова-папулярнай і мастацкай літаратуры, казкі.

Звесткі аб рэцэнзіях на беларускія выданні сабраны ў раздзеле "У полі зроку рэцэнзента".

Дванаццаты нумар бюлетэня змяшчае своеасаблівы ключ да беларусазнаўчых матэрыялаў, адлюстраваных за год, — персанальны, геаграфічны, прадметна-тэматычны дапаможныя паказальнікі.

Знамянальныя і памятныя падзеі рэспублікі, юбілеі выдатных дзеячаў знайшлі сваё месца ў раздзеле "Памятныя даты беларускага календара". Да кожнай даты даецца ўступны тэкст і спіс літаратуры, у які ўключаюцца не толькі новыя выданні, але і дарэвалюцыйная літаратура, літаратура 20-ых гг., публікацыі на іншых мовах.

Кожны нумар "Новых кніг Беларусі" суправаджаецца дадаткам — значным па памеры бібліяграфічным спісам. Тэматыка дадаткаў вызначаецца актуальнымі грамадска-палітычнымі праблемамі, важнейшымі падзеямі гісторыі і культурнага жыцця Беларусі. Дадатак — не толькі бібліяграфічны дапаможнік, гэта, акрамя іншага, цікавае і пазнавальнае чытанне. Вось некаторыя тэмы дадаткаў: "Постаці беларускага адраджэння" (№2, 1994); "Трагедыя вайны ў памяці народнай" (Да 50-годдзя вызвалення Беларусі) (№4, 1994); "Краязнаўчыя матэрыялы на старонках друку на Беларусі (пачатак XX ст. — 20-ыя гг. XX ст.) (№5, 1994); "Беларускі рок" (№7, 1994); "Нацыянальнае адраджэнне і нацыянальная школа" (№10, 1994). Першы нумар бюлетэня за 1995 г. змяшчае дадатак "Некаранаваныя каралі Вялікага княства Літоўскага (Радзівілы ў гісторыі Беларусі)". Падрыхтаваны да друку дадатак №4 "Проза беларускага замежжа".

Ён знаёміць з празаічнымі творамі беларускіх пісьменнікаў — эмігрантаў з ЗША, Канады, Германіі і інш. краін, а таксама з творамі беларускіх пісьменнікаў Беласточчыны. Прадстаўленыя творы дазваляюць скласці ўражанне пра творчую дзейнасць нашых суродзічаў у эміграцыі. Частка з іх пабачыла свет толькі за мяжой, а некаторыя творы ў апошнія гады былі выдадзены і рэспубліканскімі выдавецтвамі. Прапануемыя замежныя выданні чытач зможа атрымаць у Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь.

Мы спадзяёмся, што знаёмства з бюлетэнем "Новыя кнігі Беларусі" стане для вас прыемнай падзеяй, увядзе ў займальную краіну бібліяграфіі. А ўбачыць яго вы можаце не толькі ў Нацыянальнай бібліятэцы, але і ў любой масавай бібліятэцы рэспублікі, або набыць у кіёску Таварыства беларускай мовы імя Ф.Скарыны ці атрымаць па падпісцы (індэкс 74 972).

*Н.І.Бягун,*
*вядучы бібліёграф навукова-бібліяграфічнага аддзела Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі*